УДК 34(09)

***А.Ф. Вішнеўскі**, доктар гістарычных навук, прафесар права, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржывы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*

# РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РАДЫКАЛІЗМ У ПАРЭФОРМЕННАЙ РАСІІ – ПРАДВЕСНІК РЭПРЭСІЎНАГА ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОГА РЭЖЫМУ БАЛЬШАВІКОЎ

*Аналізуюцца ідэі і дзейнасць леварадыкальных апазіцыянераў у барацьбе з царызмам пасля адмены прыгоннага права. Вызначаецца роля паліцыі ў стрымліванні рэвалюцыйнага руху. Паказваюцца адносіны У.І. Леніна да палітычнага тэрору, а таксама праводзіцца думка аб тым, што парасткі таталітарнай ідэалогіі, якая парадзіла «вялікі тэрор» сталінскага часу, выросшчвалася ў рэвалюцыйнай «лабараторыі» левых радыкалаў другой паловы XIX ст.*

*The ideas of ideological substance of left-wing radical oppositionists in the struggle against tsarism after the abolition of serfdom are analyzed in the article. The role of police in restraint of revolutionary movement is determined. The given article shows Lenin's attitude to political terror, as well as the idea that germs of totalitarian ideology that spawned the Great Terror of Stalin's time, were cultivated in revolutionary «laboratory» of the left radicals in the second half of the 19th century.*

Аналіз рэпрэсіўнай практыкі палітычнай юстыцыі царызму дазваляе сцвярджаць, што гэта не была толькі ахоўная мера дзяржаўнага апарату ад тых праяўленняў незадавальнення ўладай, якое назіралася ў рэальным жыцці. На самой справе крыніцай канфліктаў, якія пераcталі ў жорсткую барацьбу, у значнай ступені была і сама царская адміністрацыя. Яна сваімі дзеяннямі выклікала ўсеагульнае незадавальненне і абурэнне, нявер'е ў магчымасць дабіцца элементарнай справядлівасці.

Прыгонніцтва, якое захавалася да другой паловы XIX ст., цялесныя пакаранні, адсутнасць галоснасці, невядомасць такога паняцця, як «правы чалавека», паліцэйскія рэпрэсіі – усё гэта ператварала простых людзей імперыі ў «вінцікі» дзяржаўнай машыны самаўладдзя. Чалавек па самому вызначэнню не мог адчуваць сябе суверэннай, свабоднай асобай. Невыпадкова, калі ў 1909 г. у Дзяржаўнай Думе абмяркоўвалі законапраект аб недатыкальнасці асобы, адзін з дэпутатаў сказаў наступнае: «Калі чым-небудзь характэрна рускае жыццё і калі вызначаецца чым-небудзь руская гісторыя ў цэлым, дык гэта самым поўным самавольствам і самым бессэнсоўным парушэннем правоў асобы і павагі да яе... Увесь лад рускай дзяржаўнасці, увесь уклад рускага жыцця накіраваны да таго, каб знішчыць асобу, знішчыць самадзейнасць у асобе» [5, с. 293].

Аднак і барацьба з гэтымі антыдэмакратычнымі, гістарычна ўстарэлымі парадкамі вялася таксама нецывілізаванымі метадамі. Насілле ў адказ на насілле, тэрор супраць дэспатызму адміністрацыі – вось шлях расійскіх рэвалюцыянераў-радыкалаў, якія яшчэ ў XIX ст. паставілі перад сабой і грамадствам канкрэтную мэту звяржэння старога ладу і насільнага насаджэння новых парадкаў, якія павінны былі прывесці да раю на зямлі.

У барацьбе дэмакратычных сіл супраць царскага самаўладдзя ў XIX ст. умоўна можна выдзяліць тры падыходы да вырашэння праблемы. Па-першае, у асяроддзі ліберальна настроенай грамадскасці былі такія прадстаўнікі, якія лічылі магчымай паступовую мадэрнізацыю існуючага ладу праз адукаванага манарха: менавіта ён свядома пазбавіць народ ад векавых аковаў прыгонніцтва, павядзе сваю краіну па шляху еўрапейскіх дзяржаў. Па-другое, былі і такія прадстаўнікі, якія ўскладалі надзеі на асвету народных мас, на ператварэнне іх у самастойную сілу, якая рашуча скіне кандалы самаўладдзя. Але пачынаючы з 60-х гг. XIX ст. асабліва месца ў расійскай гісторыі сталі займаць радыкальныя, экстрэмісцкія погляды, якія выключалі мірнае і паступовае рашэнне набалелых праблем. Яны будавалі свае разлікі на актыўнасці вузкага кола змоўшчыкаў, здольных захапіць дзяржаўную ўладу і перабудаваць грамадства па асабістаму плану.

Трэба прызнаць, што царызм сваімі дзеяннямі падчас сам правакаваў стварэнне леварадыкальнай апазіцыі: нават на зусім бяскрыўдныя дзеянні і выступленні ліберальнага кшталту ён адказваў рэпрэсіямі, закрыццём газет і часопісаў, паліцэйскім наглядам за універсітэцкай прафесурай, усеагульнай сочкай. Нядзіўна, што радыкальныя ідэі ў некаторых колах расійскага грамадства атрымалі дастаткова шырокае распаўсюджанне. Радыкальны накірунак у другой палове XIX ст. пачаў афармляцца ў розныя групы і гурткі, у рэвалюцыйныя арганізацыі тыпу «Зямлі і волі», «Народнай волі». З'явіліся прафесійныя рэвалюцыянеры, узнік антыўрадавы тэрарызм, які суправаджаўся актыўнай рэвалюцыйнай прапагандай.

Многія з разначыннай інтэлігенцыі і універсітэцкай моладзі не былі задаволены рэформамі Аляксандра II. Самыя радыкальныя з разначынцаў адносіліся адмоўна і да заходняга «буржуазнага» парламентарызму, заклікалі да поўнага разбурэння існуючага ладу ў імя нейкага гіпатэтычнага сацыялізму і зусім няяснай «светлай будучыні». У той жа час улада, напалоханая «крамолай», пачынала праследаваць не толькі рэвалюцыйна-анархісцкія, але і ліберальныя намеры, пашыраючы лагер апазіцыі: «Уся сістэма гоніць у стан незадаволеных, у прапаганду рэвалюцыі нават тых, каму агідныя кроў і насілле», – пісала публіцыстка М. Цэбрыкава, за што і сама паплацілася ссылкай [19, с. 30]. «Гэта працяглая і трагічная барацьба двух сляпых, улады і апазіцыі, завяршылася праз паўстагоддзе абвалам 1917 года» [15, с. 267].

Аналіз дакументальнага матэрыялу, друкаванай спадчыны леварадыкальных апазіцыянераў сведчыць аб тым, што іх мэтай было татальнае разбурэнне старога грамадства. Напрыклад, у ананімнай пракламацыі «Пачаткі рэвалюцыі» (1869), аўтарамі якой, верагодна, былі М. Бакунін і С. Нячаеў, гаворка ішла аб неабходнасці «замены ўсіх, без выключэння, формаў сучаснага еўрапейскага жыцця новымі, зусім супрацьлеглымі... Дадзенае пакаленне павінна само ўтварыць нікому не даючую літасці грубую сілу і ісці няспынна па дарозе разбурэння» [16, с. 218, 220]. Характэрна, што разбурэнню падлягалі і юрыдычныя ўстановы, і прынцыпы іх дзейнасці. Так, у артыкуле «Галоўныя асновы будучага грамадскага ладу» С. Нячаеў падкрэсліваў, што «ўсе юрыдычныя, саслоўныя правы, абавязкі і інстытуцыі, асвячоныя рэлігійнай бязглуздзіцай, не маюць месца пры новым ладзе рабочага жыцця. Знішчаюцца ўсе магчымыя гарантыі, як паліцэйскія, так і ўрадавыя» [16, с. 266]. Абвяшчалася вайна «буржуазным тэорыям індывідуальнай свабоды», кнізе супрацьпастаўляўся рэвальвер, а «пропаведзь да народа пра лепшы для яго грамадскі лад» прапаноўвалася замяніць «выстраламі па ворагах народа» [16, с. 328].

Разбурэнне старога ладу, на думку рэвалюцыянераў таго часу, павінна было суправаджацца насільным насаджэннем новых парадкаў: абавязковая для ўсіх праца, татальны кантроль, грамадскае выхаванне дзяцей, харчаванне ў грамадскіх сталовых. Мэтаю расійскіх радыкалаў было: «знішчэнне шлюбу, як з'явы ў вышэйшай ступені амаральнай, і... знішчэнне сям'і, якая перашкаджае развіццю чалавека» [15, с. 272].

Думка аб насільным навязванні народу гатовай «мадэлі» перабудовы грамадства пранізвае ўсю літаратуру другой паловы XIX ст., аўтарамі якой былі леварадыкальныя апаненты ўлады. Падкрэслівалася, што на чале рэвалюцыі павінна стаяць тайная арганізацыя, пабудаваная па іерархічнаму прынцыпу, з жорсткай дысцыплінай, падпарадкаваная адзінаму кіраўніцтву. П. Ткачоў у заснаваным ім часопісе «Набат» (1857) пісаў, што ажыццявіць рэвалюцыйныя задачы «могуць, вядома, толькі людзі разумова і маральна развітыя, г. зн. меншасць. Гэта меншасць заўсёды мае і павінна мець разумовую і маральную ўладу над большасцю. Значыць, рэвалюцыянеры – людзі гэтай меншасці... неабходна валодаюць і, застаючыся рэвалюцыянерамі, не могуць не валодаць уладай» [16, с. 348–349].

Далей тлумачыцца, што пасля рэвалюцыі гэта ўлада набывае дзяржаўны характар. І самае галоўнае. «Народ, – пісаў П. Ткачоў, – не мае істотнага значэння як становучая рэвалюцыйная сіла... Ён верне сабе адабраную ў яго зямлю, ён разбурыць усё, што да гэтай пары душыла і гняло яго свет, яго абшчыну, ён жорстка адпомсціць сваім ворагам. Але далей ён не пойдзе... Такім чынам, нават у справе разбурэння рэвалюцыйная сіла нашага народа можа мець толькі адноснае значэнне. Абапіраючыся на яе, карыстаючыся ёю, рэвалюцыйная меншасць знішчыць непасрэдных ворагаў рэвалюцыі і ліквідуе першапачатковыя перапоны, якія перашкаджаюць практычнаму здзяйсненню сацыяльна-рэвалюцыйных ідэалаў» [18, с. 265].

Усё ж патрэбна прызнаць, што пасля забойства Аляксандра II рэформа палітычнай паліцыі дазволіла актывізаваць і палепшыць работу па барацьбе з рэвалюцыйным рухам. Аб гэтым

сведчаць агляды важнейшых дазнанняў, якія праводзіліся ў жандарскіх упраўленнях імперыі па дзяржаўных злачынствах. У аглядзе за 1887 г. гаварылася: «Па меры якаснага і колькаснага паляпшэння паліцэйскай дзейнасці, за апошнія гады стала амаль немагчымым устанавіць і правільна падтрымаць рэвалюцыйныя сувязі і зносіны... Усе імкненні наладзіць якую-небудзь агульную „рэвалюцыйную справу“, якая б стаяла ў залежнасці ад „партыі“, не мелі трывалага поспеху» [11, с. 16–17]. Важную ролю ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам адыгрывала і такая «зброя» палітычнай паліцыі, як правакацыя. Першым сярод іншых «бацькам правакацыі» быў палкоўнік Зубатаў. Паліцыя пранікала ва ўсе рэвалюцыйныя рухі, партыі, групы і старалася кантраляваць іх дзейнасць. Паліцэйскія стратэгі імкнуліся нацкаваць (праз сваіх агентаў) адну партыю супраць другой, стварыць спрыяльныя ўмовы для дзейнасці сваіх выхаванцаў, бязлітасна праследавалі іх праціўнікаў. Класічным прыкладам палітычнай правакацыі з'яўляецца дзейнасць Е.Ф. Азефа, які больш за 15 гадоў быў тайным паліцэйскім агентам і ў той жа час больш за 5 гадоў кіраваў баявой арганізацыяй эсэраў [13]. Сучасны біёграф Аляксандра III прыходзіць да высновы, што палітычны рэжым пры ім няўхільна набліжаўся да таталітарнага. Аўтар бачыць галоўную прыкмету апошняга ў нецярпімасці да іншадумства, параўноўваючы «самаўладную дзяржаву, аўтарытарную па сваёй прыродзе, з дыктатурай пралетарыяту» [17, с. 283]. На наш погляд, нецярпімасць да іншадумства – адна з прыкмет таталітарнага рэжыму, але не галоўная, не «зыходная». Таталітарызм – гэта сістэма, якая парушае асабістыя законы, жыве ў адпаведнасці з воляй вышэйшай інстанцыі – партыі і яе правадыра. Па сутнасці, сапраўдны таталітарызм – гэта параджэнне XX ст., таму «параўноўваць так званы царскі дэспатызм з савецкім таталітарным ладам магчыма толькі поўнасцю страціўшы адчуванне гістарычнай меры» [15, с. 611]. Сістэма Аляксандра III, якая брала за аснову поўны кантроль над грамадствам і дзяржавай, бачыла сваёй галоўнай задачай захаванне самаўладдзя, была хутчэй на шляху да ўсталявання абсалютнага паліцэйскага рэжыму. Трэба пагадзіцца з думкай Р. Пайпса аб тым, што «ў канчатковым выніку цяжка было б сцвярджаць, што царская Расія з'яўлялася стопрацэнтнай паліцэйскай дзяржавай; хутчэй, яна з'яўлялася папярэдніцай, грубым прататыпам такога рэжыму, ёй было далёка да закончанай яго формы. У сістэме было вельмі многа недахопаў, узнікшых часцей за ўсё ад таго, што правячая эліта Расіі ўспрыняла заходнія інстытуты і каштоўнасці, ад якіх не жадала адмаўляцца, нягледзячы на іх несумяшчальнасць з вотчынным духам. Гэтыя недахопы ў значнай ступені зводзілі на нішто ўвесь унушальны набор рэпрэсіўных мер, уведзеных у 1870–1880-я гады.

Сярод вышэйзгаданых проціваг, бадай, найбольш важнай была прыватная ўласнасць... Дзякуючы прыватнай уласнасці, па ўсёй тэрыторыі імперыі ствараліся куткі, куды паліцыя была бяссільнай ступіць, паколькі законы, бесцырымонна парушаўшыя правы асобы, строга ахоўвалі права ўласнасці» [14, с. 409–410].

Але мы павінны адзначыць адну заканамернасць: усякая палітычная або ідэалагічная плынь, якая мае месца асабліва ў вялікай краіне і на працягу доўгага часу, не праходзіць бясследна для яе будучыні. Расійскі рэвалюцыйны радыкалізм XIX ст., пры ўсіх далейшых варыяцыях, прылівах і адлівах, наступленнях і адкатах, значна паўплываў на псіхалогію, ідэалогію і палітычную практыку тых, хто прыйшоў яму на змену ўжо ў XX ст. Асабліва гэта тычылася расійскай сацыял-дэмакратыі і яе бальшавіцкага крыла, якое ўзначаліла рэвалюцыйны пераварот і больш за 70 гадоў будавала новае грамадства.

Было б памылкай лічыць, што бальшавікі поўнасцю падзялялі крайнія левaрадыкальныя погляды рэвалюцыянераў XIX ст. Ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі была заснавана на прыданні рашаючага значэння класам, народным масам як пры захопе дзяржаўнай улады, так і ў далейшай перабудове грамадскіх адносін [10, с. 1–13]. Але нельга адмаўляць і тое, што ў працэсе станаўлення і ўмацавання таталітарнага рэжыму ўдзел народа ў кіраванні дзяржавай усё больш адыходзіў на задні план. Не народ кіраваў грамадствам, не ён вырашаў дзяржаўныя справы. Гэта рабіла партыя, у якой складвалася вузкае кола кіраўнікоў, аж да адзінаасобнай фігуры правадыра.

Вельмі важна спыніцца на тых метадах, якімі згодна з леварадыкальнымі поглядамі рэвалюцыянеры павінны былі вырашаць свае задачы. Гэтыя метады, па сутнасці, зводзіліся да аднаго – насілля і тэрору. Прапагандзе насілля была прысвечана шматлікая падпольная літаратура. «Можа здарыцца, – гаварылася ў пракламацыі «Маладая Расія» (1862), – што ўся

справа закончыцца адным знішчэннем царскай фаміліі, гэта значыць якой-небудзь сотні, другой людзей, але можа здарыцца, і гэта апошняе вярней, што ўся імператарская партыя, як адзін чалавек, стане за гасудара. У апошнім выпадку... мы крыкнем толькі: „у тапары“, і тады... тады бі імператарскую партыю не шкадуючы. Памятай, што тады хто будзе не з намі, будзе супраць; хто супраць – той наш вораг; а ворагаў неабходна знішчаць усімі спосабамі» [16, с. 149].

Паводле ўспамінаў сястры П. Ткачова, ён, калі выйшаў з турмы, выказаў наступную думку: «для абнаўлення Расіі неабходна знішчыць усіх людзей, старэйшых за 25 гадоў» [1, с. 62]. Праз некаторы час Ткачоў адмовіўся ад гэтага «чалавеказабойнага» плана, але заставаўся на тым, «што для агульнага шчасця не толькі можна, але нават неабходна ахвяраваць некаторымі асобамі» [1, с. 62].

Насілле ў перыяд барацьбы з царскім самаўладдзем непазбежна пераходзіла ў акты тэрарызму. «Палітычнае забойства, – пісаў М. Марозаў, – гэта адзіны сродак самаабароны пры дадзеных абставінах і адзін з лепшых агітацыйных прыёмаў. Палітычнае забойства – гэта самая страшная зброя для нашых ворагаў, зброя, супраць якой не дапамагаюць ім ні грозныя арміі, ні легіёны шпіёнаў» [7, с. 93].

У праграме тэрарыстычнай фракцыі партыі «Народная воля», якую падрыхтаваў А.І. Ульянаў, таксама падкрэслівалася: «Прызнаючы галоўнае значэнне тэрору як сродку вымушэння ва ўрада ўступак шляхам сістэматычнай яго дэзарганізацыі, мы ніколькі не прымяншаем і іншых яго карысных бакоў... Таму мы лічым карыснай не толькі тэрарыстычную барацьбу з цэнтральным урадам, але і мясцовыя тэрарыстычныя пратэсты супраць адміністрацыйнага ўціску» [6, с. 47]. І гэта не заставалася на паперы, а рэальна ператваралася ў рэвалюцыйную практыку. Паводле няпоўных даных, рэвалюцыянерамі, галоўным чынам эсэрамі, у гады першай расійскай рэвалюцыі было забіта і паранена не менш за 9 тыс. чалавек. Толькі ў студзені 1906 г. было учынена 80 палітычных забойстваў, у лютым – 64, у сакавіку – 50, у красавіку – 56, у маі – 122, у чэрвені – 122. Са студзеня 1908 г. да мая 1910 г. адзначана каля 20 тыс. выпадкаў тэрарыстычных актаў і экспрапрыяцый, ад якіх пацярпела звыш 7,5 тыс. чалавек. «Па меры памнажэння тэрарыстычных актаў, – лічыць Р. Пайпс, – улады прыходзілі ў стан, блізкі да панікі. Хоць сапраўдная колькасць тэрарыстаў у кожны дадзены момант была зусім невялікая… такая ўжо псіхалогія аўтарытарнага рэжыму, што ён схільны рэагаваць на прамы выклік куды больш энергічна, чым трэба. У сваім імкненні адказаць на пагрозу, якую ўяўлялі сабой тэрарысты, царскі ўрад яўна перастараўся. Дзе адкрыта, дзе тайна ён узяўся за ўвядзенне контрмер, якія ў сваёй сукупнасці надзвычай добра вызначылі наперад сучасную паліцэйскую дзяржаву і нават утрымлівалі ў сабе парасткі таталітарызму... Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што карані сучаснага таталітарызму неабходна шукаць хутчэй тут, чым у ідэях Русо, Гегеля ці Маркса. Таму што, хоць ідэі, безумоўна, могуць парадзіць новыя ідэі, яны прыводзяць да арганізацыйных перамен толькі калі трапяць на глебу, гатовую іх прыняць» [14, с. 389–390].

Цікава адзначыць, што ў падрыхтаваным У.І. Леніным праекце рэзалюцыі «Аб тэроры» да ІІ з’езда РСДРП указвалася: «З’езд рашуча адхіляе тэрор, г. зн. сістэму адзінкавых палітычных забойстваў, як спосаб палітычнай барацьбы» [9, с. 251]. Але бальшавікі размяжоўвалі індывідуальны і масавы тэрор. З гэтай нагоды Ленін пісаў наступнае: «Прынцыпова мы ніколі не адмаўляліся і не маглі адмовіца ад тэрору. Гэта адно з ваенных дзеянняў, якое можа быць прыгодна і нават неабходна ў пэўны момант бітвы, пры пэўным стане войска і пры пэўных абставінах» [10, с. 7]. Сказанае было пацверджана практыкай «чырвонага тэрору» ў 1918 г., ліквідацыяй казакоў Дона і Кубані як сацыяльнай групы ў 1919 г., уціхамірваннем беларускіх сялян у першай палове 20-х гадоў, іх раскулачваннем у 1930–1932 гг. і інш.

Зразумела, прамой генетычнай сувязі паміж расійскім рэвалюцыйным радыкалізмам і бальшавізмам, які рыхтаваў і здзяйсняў рэвалюцыю, няма. Гаворка ідзе аб тым, што апошнія пры ўсёй самастойнасці сваёй стратэгіі і тактыкі ў свой час зведалі значны ўплыў крайніх радыкальных ідэй і гэта не засталося без наступстваў. Так, напрыклад, у сваёй працы «Што рабіць?» (1902) Ленін лічыць індывідуальны тэрор слабасцю рэвалюцыйнага руху, разам з тым прапаноўвае тэзісы, якія ў некаторай меры пераклікаюцца з поглядамі левых радыкалаў: мы выбралі шлях барацьбы, а не прымірэння, наша бліжэйшая задача – разбурэнне самай магутнай апоры не толькі еўрапейскай, але таксама (можам і мы сказаць зараз) азіяцкай рэакцыі; рэвалюцыная сацыял-дэмакратычная партыя павінна складацца з прафесіяналаў, быць не вельмі

шырокай і, магчыма, больш канспіратыўнай і г. д. Як вядома, у далейшым усе гэтыя ідэі былі развіты і паслядоўна праводзіліся ў жыццё.

Характэрнымі рысамі рэвалюцыйных радыкалаў XIX ст. былі нецярпімасць да палітычных апанентаў, хаця яны і належалі да таго ж самага рэвалюцыйнага лагера, гатоўнасць да вераломных і бязлітасных метадаў барацьбы, адмаўленне асабістых пачуццяў і сімпатый. Найбольш паказальным у гэтых адносінах з'яўляецца «Катэхізіс рэвалюцыянера» (1869), аўтарамі якога былі С. Нячаеў і М. Бакунін і ў якім змяшчаліся досыць цынічныя парады наконт метадаў падпольнай работы. На словах адмаўляючы гэты дакумент, прасякнуты экстрэмізмам і амаралізмам, многія рэвалюцыянеры, асабліва маладыя, па сутнасці прытрымліваліся яго рэкамендацый.

Аналізуючы псіхалогію і ідэалогію рэвалюцыянераў другой паловы XIX – пачатку XX ст., даследчык Ю.М. Антанян адзначае наступныя рысы: чорна-белае бачанне свету, падзел людзей на сваіх-чужых і абгрунтаванне ў гэтай сувязі магчымасці знішчэння чужых; маральнае «апраўданне» тэрарызму спасылкамі на амаральнасць пануючых класаў; гіпертрафіраванае ўяўленне аб насіллі з боку ўлады і на гэтай падставе апраўданне тэрору; давядзенне да абсурду крытыкі існуючага права і адсюль – адмаўленне права наогул, прызнанне магчымасці парушэння дзеючага заканадаўства; нецярпімасць да чужых поглядаў, месіянскія прэтэнзіі [2, с. 73]. Многія з названых рыс былі ўспрыняты бальшавікамі.

Нельга думаць, што радыкалізм быў адзінай плынню расійскай палітычнай думкі. У пачатку XX ст. на палітычнай авансцэне дзейнічалі тры галоўныя вектары палітычных накірункаў: традыцыйны (дзяржаўна-ахоўны), рэфармісцка-ліберальны і радыкальна-разбуральны. Пры гэтым адзначым, што ўмерана-дэмакратычныя погляды карысталіся больш шырокім уплывам сярод насельніцтва. Ліберальная інтэлігенцыя Расіі паслядоўна выказвалася за ўстанаўленне канстытуцыйнага парадку і народнага прадстаўніцтва законным шляхам, «без пераваротаў і рэзкіх змен» [12, с. 10]. Такая платформа была, напрыклад, дакладна сфармулявана этнічным беларусам, вядомым юрыстам і грамадскім дзеячам У.Д. Спасовічам: «Я за ўсякі прагрэс, але легальны, за ўсякую эвалюцыю, але не рэвалюцыю, за ўстанаўленне парадку па падставе згоды ўсіх партый на арэне парламенту – без кровапраліцця і забойніцтваў» [3, с. 148]. На такіх жа пазіцыях стаялі вучоныя-юрысты Л.І. Петражыцкі, І.Я. Файніцкі і інш. [4, с. 120–125].

Крайні левы экстрэмізм стаў асабліва значнай сілаю тады, калі на пярэдні план рэвалюцыйнай барацьбы выйшлі прамысловыя рабочыя і сяляне, калі выявіліся выключныя масавасць грамадскіх рухаў, жорсткасць сацыяльных сутыкненняў і нястрымная хваля насілля, якая ішла ад супрацьборствуючых бакоў. Зразумела, што ў гэты момант левардыкальныя настроі не маглі не паўплываць на моладзь – непасрэдных удзельнікаў рэвалюцыі. Умераныя, насамрэч дэмакратычныя сілы, апазіцыйныя царскаму самаўладдзю, аказаліся пераможанымі, задушанымі рэвалюцыйным радыкалізмам мас, а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. наогул зышлі з гістарычнай сцэны. Іх прыхільнікі эмігрыравалі або апынуліся ў ліку «былых людзей», якія падлягалі выцясненню з грамадскага жыцця. У той жа час рэвалюцыя дазволіла з глыбіні грамадскай свядомасці вырвацца на паверхню злосці рабочых і сялян як рэакцыі на непрыхаваны прыгнёт капіталістаў і памешчыкаў, прывычкам да прымянення насілля, выкліканым Першай сусветнай вайной з яе абясцэньваннем чалавечага жыцця і агульным «азвярэннем і адзічэннем». Усё гэта стварыла «выбуховую сумесь, эфект якой мог быць сапраўды спусташальным ва ўмовах рэвалюцыйнай Расіі, дзе на фоне краху традыцыйных інстытутаў улады назіраўся велізарны рост усіх разбуральных імпульсаў, якія прымножыліся за доўгія гады» [8, с. 84]. Як бачым, з цягам часу абстрактныя ідэі пабудовы прынцыпова новага грамадскага ладу ўскалыхнулі масы і сталі рухаючай сілай нябачных у гісторыі рэвалюцыйных падзей.

Такім чынам, зараз стала зразумелым тое, што яшчэ ў рэвалюцыйнай «лабараторыі» левых радыкалаў другой паловы XIX ст. вырошчваліся парасткі таталітарнай ідэалогіі і палітыкі, вольна або нявольна закладваўся будучы фундамент тых гвалтоўных дзеянняў у адносінах да свайго народа, якія пастуова парадзілі «вялікі тэрор» сталінскага часу.

Нягледзячы на тое, што расійскі рэвалюцыйны радыкалізм не быў пануючым накірункам айчыннай палітычнай думкі, тым не менш ён налажыў у далейшым вельмі негатыўны адбітак на склад думак і характар учынкаў многіх людзей, якія рабілі рэвалюцыю. У гэтым сэнсе рускі бланкізм з яго абсалютызацыяй рэвалюцыйнага пачатку і поўным адмаўленнем сацыяльнага рэфарматарства паслужыў ідэйна-псіхалагічнай перадумовай практыкі насілля і тэрору, якім

прыдавалася значэнне стваральнай сілы ў справе перабудовы грамадства. Падзеі, якія адбываліся ўжо пасля рэвалюцыі: «дыктатура партыі, адцісканне народа як дзейнай сацыяльнай і палітычнай сілы, насільная ломка эканамічнага ладу народнага жыцця ў імя абстрактнай ідэі, дасягнення мэты любой цаной… перакрэслівалі гуманістычную ідэю, закладзеную ў сацыялізме, параджалі трагічную супярэчнасць паміж ідэямі і рэчаіснасцю» [16, с. 389].

Бібліяграфічныя спасылкі


1. Анненская А. Из прошлых лет // Рус. богатство. 1913. № 1.
2. Антонян Ю.М. Терроризм. М., 1998.
3. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мінск, 2004.
4. Вішнеўская І.У. Прававыя і палітычныя погляды беларускіх юрыстаў XIX – пачатку XX ст. // Вестн. Акад. МВД Респ. Беларусь. 2004. № 1 (7).
5. Государственная дума 1906–1917 гг. : стенограф. отчёты. М., 1995. Т. 3.
6. История России: XX век. / под ред. В.П. Дмитренко. М., 1996.
7. История терроризма в России в документах, биографиях, исследованиях. Ростов н/Д, 1996.
8. Куртуа С., Верт Н., Панне Ж. Чёрная книга коммунизма: преступления, террор, репрессии : пер. с фр. М., 1999.
9. Ленин В.И. Проект резолюции о терроре // Полн. собр. соч. Т. 7.
10. Ленин В.И. С чего начать? // Полн. собр. соч. Т. 5.
11. Меньшиков Л. Охрана и революция: к истории тайных политических организаций, существовавших во времена самодержавия. 1885–1898. М., 1925.
12. Муромцев С.А. Право и справедливость // Сборник правоведческих и общественных знаний. СПб., 1893.
13. Николаевсий Б.Н. История одного предательства: террористы и политическая полиция. М., 1991.
14. Пайпс Р. Россия при старом режиме. М., 1993.
15. Пушкарёв С.Г. Россия 1801–1917: власть и общество. М., 2001.
16. Революционный радикализм в России: век девятнадцатый. М., 1997.
17. Твардовский В.А. Александр III // Российские самодержцы. М., 1990.
18. Ткачёв П.Н. Избранные сочинения на социально-политические темы. М., 1933.
19. Цебрикова М.К. Письмо к Александру III. СПб., 1906.


Дата паступлення ў рэдакцыю: 04.03.2011

УДК 351.74(09)

***В.А. Данилов****, кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры теории и истории государства и права Академии МВД Республики Беларусь*

## ИЗ ОПЫТА ВОСПИТАТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ В КОЛОНИЯХ НКВД – МВД БЕЛАРУСИ ДЛЯ НЕСОВЕРШЕННОЛЕТНИХ В ПОСЛЕВОЕННЫЕ ГОДЫ (1944–1953 гг.)

*На основании архивных материалов анализируется и обобщается опыт работы органов и подразделений НКВД по организации и проведению воспитательной работы с несовершеннолетними беспризорниками и правонарушителями. Одним из следствий войны в Беларуси стало появление огромного количества беспризорных и безнадзорных детей. Возвращение таких детей обществу, к нормальной жизни требовало от государства и уполномоченных органов особого подхода, применения мер не карательного, а воспитательного воздействия. Выполнение этой работы было возложено на НКВД и его специальные учреждения – детские трудовые воспитательные колонии.*

*This article is basised on the true archival materials. It is analised and generalized experience of bodies and divisions of People's Commissariat of Internal Affairs on the organization and carrying out of educational work with minor homeless children and offenders. Occurrence of a large quantity of homeless and neglected children became one of war consequences in Belarus. Returning of such children to a society, to normal life demanded from the state and the authorized bodies of the special approach, application of measures not retaliatory, but educational influence. Performance of this work has been assigned to People's Commissariat of Internal Affairs and its special establishments – children's labor educational colonies.*

Одним из первых шагов органов власти на освобожденных от немецко-фашистских оккупантов территориях Беларуси была организация специализированных учреждений – детских трудовых воспитательных колоний. В июне 1943 г. постановлением СНК СССР «Об усилении мер борьбы с детской беспризорностью, безнадзорностью и хулиганством» НКВД СССР поручалось создание особых воспитательных учреждений – детских трудовых и воспитательных колоний для несовершеннолетних правонарушителей в возрасте от 11 до 16 лет (к ним относились и подлежали содержанию в колониях беспризорники, не имевшие родителей или долго проживавшие без них и не имевшие определенного места жительства, дети и подростки, задержанные за незначительные преступления, по которым уголовное преследование не возбу-